Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 4 (109), 2018

*УДК 930(47+57):94:327(470+438)"193"*

# Савецкая гістарыяграфія адносін паміж Савецкай Расіяй / СССР і Польшчай: змена парадыгмы даследаванняў у 1930-я гады

М.М. Мязга

Разгледжаны перамены, якія адбыліся ў 1930-я гады ў савецкай гістарыяграфіі савецка-польскіх адносін. Паказана, што яны былі абумоўлены галоўным чынам зменамі ў дзяржаўнай гістарычнай палітыцы, якая эвалюцыяніравала пад уздзеяннем перамен у знешнепалітычным курсе СССР. Падыходы савецкіх гісторыкаў да вывучэння савецка-польскіх адносін пад уздзеяннем перш за ўсё палітычнага фактару ў акрэслены час змяніліся настолькі істотна, што ёсць падставы гаварыць аб фарміраванні новай парадыгмы даследаванняў.
**Ключавыя словы:** гістарыяграфія, савецка-польскія адносіны, даследчая прадыгма, гістарычная палітыка, класавы падыход, ідэя сусветнай рэвалюцыі, пераймальнасць у знешняй плітыцы, дзяржаўны інтарэс, Усходняя Еўропа.

The changes that happened in Soviet historiography of Soviet-Polish relationship in 1930s are discussed. It is shown that they were mainly caused by the changes of government historical politics, which had evolved due to the changes in foreign politics of USSR. The approach used by Soviet historians to study Soviet-Polish relationship changed in such a significant way, that it is possible to say that they started a new research paradigm for their field.
**Keywords:** historiography, Soviet-Polish relationship, research paradigm, historical politics, class approach, idea of the world revolution, continuity in foreign policy, government interest, Eastern Europe.

Праблема польска-савецкіх адносін займала важнае месца ў савецкай гістарычнай навуцы міжваеннага часу, што звязана з высокай ступенню яе палітычнай актуальнасці. Працы па гісторыі савецка-польскіх адносін прыцягвалі ўвагу як савецкай і партыйнай эліты, так грамадства ў цэлым. Дзяржава і правячая партыя фармавалі гістарычную палітыку, у рамках якой вызначалі асноўныя гістарыяграфічныя палажэнні, на адстойванне якіх нацэльвалася гістарычная навука. У дадзеным артыкуле мы паспрабуем вызначыць, якія змены адбыліся ў савецкай гістарыяграфіі савецка-польскіх адносін у 1930-я гг. ў параўнанні з папярэднім перыядам і выявіць ролю гістарычнай палітыкі дзяржавы ў гэтым працэсе.

Пытанні, звязаныя з роляй дзяржаўнай палітыкі ў развіцці гістарычнай навукі і ўплывам на яе палітычнага фактару, актыўна абмяркоўваюцца на старонках гістарычных прац. Беларускі даследчык В.І. Менькоўскі ў гэтай сувязі сушна заўважае, што «адносная палітызацыя цалкам натуральная для гістарычнай навукі, асабліва для даследчыкаў, вывучаючых навейшую гісторыю» [1, с. 45]. Сучасны польскі гісторык А. Чубіньскі ў сваім даследаванні, прысвечаным развіццю польскай гістарычнай навукі ў міжваенны час, адзначае яе вялікую залежнасць ад палітычнага фактару. Узаемасувязь гісторыі і палітыкі прасочваецца, у прыватнасці, у тым, што ў гістарычным мінулым розныя палітычныя сілы шукалі аргументы ў карысць абгрунтавання сваіх палітычных канцэпцый [2, s. 7, 8]. У сучаснай беларускай гістарыяграфіі з'явіліся першыя працы, прысвечаныя вывучэнню гістарычнай палітыкі. Пад ёй разумеецца актыўнае выкарыстанне гістарычнай навукі ва ўнутры- і знешнепалітычных мэтах дзяржавы [3, с. 243].

Працы савецкіх даследчыкаў па гісторыі савецка-польскіх адносін, якія з'явіліся ў першае дзесяцігоддзе існавання гэтых адносін, асноўваліся на даследчай парадыгме, паводле якой міждзяржаўныя адносіны, асабліва, калі гаворка ішла аб дзяржавах з розным грамадскім ладам, разглядаліся як адна з формаў класавага, ідэалагічнага змагання. Г.Д. Аляксеева пры вывучэнні праблемы станаўлення савецкай гістарычнай навукі ў 1918–1923 гг. прыйшла да абгрунтаванай высновы, што яна з першых крокаў свайго развіцця распрацоўвае «актуальныя праблемы мінулага звязаныя з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва, барацьбой на ідэалагічным фронце» [4, с. 11–12]. Пры гэтым самі савецкія гісторыкі ўсяляк падкрэслівалі залежнасць і сувязь гісторыі з палітыкай. М.М. Пакроўскі адзначаў, што ідэалогія «ёсць адлюстраванне рэчаіснасці ў розумах людзей скрозь прызму іх інтэрасаў… І ў гэтым сэнсе

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

ўсякі гістарычны твор ёсць перш за ўсё выразчык пэўнай ідэалогіі». Акрамя таго, ён заклікаў да кожнага гістарычнага твора падыходзіць як да прадукта класавай барацьбы [5, с. 10, 12]. У.К. Шчарбакоў бачыў задачу савецкіх гісторыкаў у тым, каб весці барацьбу з вылазкамі «варожых нам класаў, з вылазкамі контррэвалюцыйных элементаў», у тым ліку і на гістарычным фронце. Задача польскіх буржуазных гісторыкаў, па яго меркаванню, заключалася ў мабілізацыі сіл на барацьбу з СССР [6, с. 8, 56].

Класавы падыход пры вывучэнні гісторыі міжнародных адносін падштурхоўваў савецкіх гісторыкаў да абгрунтавання тэзіса, паводле якога польскія правячыя колы падчас войн 1919–1920 гг. імкнуліся, першым чынам, да ўзнаўлення панавання польскіх памешчыкаў на землях Беларусі, Украіны, Літвы. К. Радак яшчэ падчас вайны пісаў у сувязі з гэтым: «Зыходным пунктам палітыкі польскага ўрада ў адносінах да Расіі з'яўляецца жаданне вырваць з рук сялян, якіх вызваліла руская рэвалюцыя, землі і вярнуць іх буйным польскім памешчыкам» [7, с. 6]. М.П. Паўловіч таксама рабіў акцэнт на класавы аспект польскіх захопаў, але інтэрпрэтаваў яго па-іншаму. Праз захоп тэрыторый польскі ўрад, па яго меркаванні, імкнуўся, па-першае, адгарадзіцца ад расійскай рэвалюцыі, па-другое, захапіць сыравіну для польскай прамысловасці, вярнуць памешчыкам іх зямлі [8, с. 22, 23].

У.І. Пічэта звязвае тэрытарыяльныя захопы Польшчы з барацьбой польскага ўрада з пагрозай рэвалюцыі. Ён лічыў, што польскія правячыя колы жадалі адсунуць мяжу далей на ўсход, каб «адгарадзіць польскую дзяржаву ад уплыву РСФСР» [9, с. 84]. Класавы характар экспансіі Польшчы на «ўсходнія крэсы», на яго думку, выяўляецца і ў тым, што яна імкнулася «вярнуць памешчыцкія маёнткі». А для гэтага трэба было знішчыць «Савецкія Рэспублікі Літвы і Беларусі» [10, с. 165]. П. Суслаў у сваю чаргу звязваў імкненне Польшчы дасягнуць меж 1772 г. з інтэрасамі «польскіх памешчыкаў, якія валодалі ў гэтых раёнах да рэвалюцыі» большасцю буйных маёнткаў [11, с. 19]. Па меркаванні М. Віслінскага, кіеўскі паход Ю. Пілсудскага таксама быў абумоўлены інтэрасамі правячых класаў Польшчы: «... паход Пілсудскага на Кіеў у 1920 г. быў спробай заваяваць калонію для польскага фінансавага і прамысловага капіталу, спробай вярнуць польскім памешчыкам маёнткі і землі ....», звергнуць савецкі лад, «у якім польская буржуазія бачыла смяротную небяспеку для сваіх класавых інтэрасаў» [12, с. 43].

На змест прац савецкіх аўтараў у 1920-я гады істотны ўплыў аказала ідэя сусветнай рэвалюцыі, якая мела падтрымку ў шэрагах кіраўніцтва Савецкай Расіі. У маі 1920 г. К. Радак у адной са сваіх прац выказваў здагадку, што, чым даўжэй будзе доўжыцца польска-савецкая вайна, тым больш шанцаў на тое, што польскія працоўныя і сяляне звергнуць «злачынную зграю польскіх памешчыкаў і капіталістаў» [7, с. 17]. М.П. Паўловіч пісаў, што знішчэнне шляхецкай Польшчы «з'явіцца ўдарам па ўсёй міжнароднай рэакцыі і прывядзе да перамогі сусветнай рэвалюцыі». Далей ён адзначаў, што з разгромам «шляхецкай Польшчы» знікне бар'ер, які аддзяляе Савецкую Расію ад Германіі і ўсёй Заходняй Еўропы, «дзе ўжо назапасілася шмат гаручага матэрыялу» [8, с. 29–30], гэта значыць, перамога над Польшчай адкрывае шлях для ажыццяўлення рэвалюцыі ў Еўропе. Такім чынам, савецкія аўтары, з аднаго боку, разглядалі пралетарскую рэвалюцыю як фактар, які павінен быў забяспечыць выхад Польшчы з вайны. У той жа час, імі фармаваўся пункт гледжання, паводле якога разгром Польшчы з'яўляўся ўмовай, неабходнай для перамогі сусветнай рэвалюцыі.

Пасля падпісання Рыжскага дагавора ў часткі савецкага кіраўніцтва захоўвалася надзея на хуткую сацыялістычную рэвалюцыю ў Польшчы, што знаходзіла адлюстраванне і ў працах савецкіх аўтараў, прысвечаных гісторыі савецка-польскіх адносін. Напрыклад, Ю. Мархлеўскі пісаў: «Ці будзе ён (Рыжскі мір – М.М.) працяглым залежыць ад працоўнага народа Польшчы» [13, с. 42]. У працах першай паловы 1920-х гг. Ю. Мархлеўскі агучваў ідэю рашэння пытання аб польска-савецкай мяжы, усталяванай у 1921 г., з дапамогай пралетарскай рэвалюцыі, але пры гэтым некалькі па-іншаму расстаўляў акцэнты. Ён пісаў, што «ў момант, калі пралетарыят Германіі звергне панаванне капіталу ў сябе, праб'е таксама апошняя гадзіна для буржуазіі ў Польшчы, бо паміж савецкай пралетарскай Германіяй і савецкай Расіяй няма месца для капіталістычнай Польшчы» [14, с. 51].

К. Радак у працы, выдадзенай у 1923 г., у сваю чаргу, заяўляў аб намеры Савецкай Расіі вярнуць згубленыя ёю заходнія ўскраіны і звязваў гэтыя надзеі, ізноў жа, з рэвалюцыяй. Ён

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

лічыў, што прызнанне Расіяй незалежнасці Польшчы, Фінляндыі, Эстоніі, Латвіі, Літвы было абумоўлена перавагай сіл Антанты. СССР не збіраецца вяртаць гэтыя тэрыторыі ўзброенай сілай, але, «калі, навучаныя горкім вопытам, ускрайкавыя дзяржавы зразумеюць неабходнасць сабраць разам усе сілы для барацьбы за вызваленне, калі гэтае разуменне прымусіць іх імкнуцца да злучэння з Савецкай Расіяй – яны будуць ёю прынятыя як раўнапраўныя ўдзельнікі Федэрацыі Савецкіх Рэспублік» [15, с. 45].

У такім выданні, як «Грамадзянская вайна 1918–1921», якое выйшла з друку ў 1930 г., пытанне аб перспектывах рэвалюцыі ў Польшчы ўжо вырашалася супярэчліва. З аднаго боку, паказвалася, што палітыка савецкага кіраўніцтва, якая будавалася ў разліку на рэвалюцыю, была правільнай і абгрунтаванай. У той жа час прызнавалася, што нацыяналістычныя настроі ахапілі дробную буржуазію і інтэлігенцыю Польшчы, а сялянства ў лепшым выпадку заставалася нейтральным, а часам выступала і варожа ў адносінах да Чырвонай Арміі [16, с. 392]. Савецкая гістарыяграфія ў 1920-я гг. фактычна прапагандавала, абгрунтоўвала і апраўдвала ідэю сусветнай рэвалюцыі, якая ў той момант з'яўлялася важнай складовай часткай савецкай знешняй палітыкі.

Сярэдзіна 1930-х гг. прынесла істотныя змены ў развіццё савецкай гістарычнай навукі. Палітычны фон, на якім адбываліся гэтыя змены, уключаў адмову І. Сталіна ад ідэі сусветнай рэвалюцыі і канцэнтрацыю намаганняў на барацьбе з фашызмам, г. з., у першую чаргу з Германіяй, што азначала шмат у чым зварот да традыцыйнай палітыкі царскай Расіі [17, с. 220–221]. Такая палітыка прадугледжвала, у тым ліку, узнаўленне панавання СССР ва Усходняй Еўропе. Як справядліва заўважае расійскі даследнік Р. Піхоя, савецкая ўлада, асабліва з 1930-х гг., палічыла патрэбным актыўна выкарыстаць гістарычную навуку для сцвярджэння свайго гістарычнага права на месца ў гісторыі Расіі. Савецкае кіраўніцтва на чале са Сталінам рыхтавала народ да вайны і разумела, што да яе неабходна рыхтаваць і масавую гістарычную свядомасць. Гэта запатрабавала змены канцэпцыі гістарычнага шляху Расіі так, каб сфармаваць у народа пачуццё патрыятызму. Гісторыкі з канца 1920-х гг. павінны былі абгрунтоўваць пераемнасць знешняй палітыкі царскай Расіі і Расіі савецкай. Для гэтага прыйшлося адмовіцца ад канцэпцыі М.М. Пакроўскага, якая мела на ўвазе кардынальны парыў савецкай гісторыі з гісторыяй царскай Расіі. Ёй на змену прыходзіла ідэя пераемнасці, якую адстойвалі Я. Тарле і С. Платонаў [17, с. 220]. Як адзначае А.М. Дуброўскі, ва ўмовах нарастання пагрозы вайны ў сярэдзіне 1930-х гг. савецкае кіраўніцтва ўсвядоміла слабасць сацыялістычных ідэалаў у якасці мабілізуючай сілы пры абароне СССР і таму вырашыла абаперціся яшчэ і на традыцыйныя расійскія каштоўнасці [18, с. 27]. Ва ўмовах нарастання пагрозы вайны ў ідэалогіі бальшавікоў усё большую ролю адыгрывалі нацыянальна-дзяржаўныя тэндэнцыі. Гістарычная навука і гістарычная адукацыя павінны былі стаць эфектыўным сродкам іх фармавання, а таксама выхавання ў савецкіх людзей пачуцця патрыятызму [18, с. 93–95].

Важнай праблемай, да якой змяняўся падыход савецкай гістарычнай навукі, было ўтварэнне Расійскай імперыі. Пры падрыхтоўцы школьных падручнікаў у 1934 г. палітбюро ўказала, што палітычнае адзінства, дасягнутае з утварэннем СССР, павінна было атрымаць у школьных падручніках па гісторыі сваё гістарычнае абгрунтаванне [19, с. 41, 50]. На пасяджэнні палітбюро 20 сакавіка 1934 г. Сталін казаў аб адмысловай ролі рускага народа, які збіраў іншыя народы ў Расійскую дзяржаву. Гэтая роля была стваральнай, яна падрыхтоўвала ўтварэнне Савецкага Саюза [18, с. 192].

Канцэптуальнымі зменамі гістарычнай палітыкі дзяржавы, якая вызначала падыходы да вывучэння гісторыі міжнародных адносін, можна растлумачыць і негатыўнае стаўленне І. Сталіна да публікацыі артыкула Ф. Энгельса «Знешняя палітыка рускага царызму» ў часопісе «Бальшавік» у 1934 г. У ёй Расія падавалася як агрэсар і апора еўрапейскай рэакцыі, на яе фактычна ўскладалася адказнасць за будучую Першую сусветную вайну. Імкненне Расіі да захопу Канстанцінопаля Энгельс назваў у якасці галоўнай прычыны будучай сусветнай вайны, з чым катэгарычна не згаджаўся Сталін [20, с. 21–22].

Змена агульнай даследчай парадыгмы пры вывучэнні гісторыі савецкай знешняй палітыкі пад уплывам новай гістарычнай палітыкі дзяржавы ўнесла істотныя змены ў змест савецкай гістарыяграфіі савецка-польскіх адносін. На першы план выходзіць тэзіс аб барацьбе Савецкай дзяржавы і Польшчы за дамінаванне ва Усходняй Еўропе. У сувязі з

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

гэтым, пры характарыстыцы польскай экспансіі акцэнт робіцца не на класавыя інтарэсы польскіх памешчыкаў і буржуазіі, а на вялікадзяржаўную палітыку Польшчы. А. Врублеўскі пісаў, што ў аснове польскай усходняй палітыкі ляжала імкненне Пілсудскага да ўзнаўлення Ягелонскай Польшчы. Са спробай рэалізацыі гэтай ідэі савецкі аўтар звязваў захоп Віленшчыны, паход на Кіеў, змаганне з савецкай рэспублікай [21, с. 200–201]. Тэзіс аб вялікадзяржаўнай палітыцы Польшчы як адной з асноўных прычын, якая прывяла да вайны, яшчэ больш выразна гучаў у савецкай гістарыяграфіі ў 30-я гг. XX ст. Я. Іофе абгрунтоўваў тэзіс аб планах «польскай буржуазіі» стварыць «вялікую Польшчу ад мора да мора», у якасці прычыны вайны ўказваў на імкненне правячых колаў Польшчы парушыць тэрытарыяльную цэласнасць савецкіх рэспублік. Гэта было звязана з іх планамі стварэння «вялікай Польшчы» з уключэннем у яе склад «Літвы, Беларусі і ўсёй Правабярэжнай Украіны» [22, с. 146, 152].

Прынцыповыя змены зведала ацэнка савецкімі гісторыкамі і польска-германскіх адносін з пункту гледжання іх уплыву на польска-савецкія. Да пачатку 1930-х гг. ва ўмовах Рапала падкрэсліваліся польскія агрэсіўныя памкненні не толькі ў адносінах да СССР, але і Германіі. Напрыклад, Л. Валынскі ў сваёй працы ўказваў, што Польшча атрымала калідор да Балтыйскага мора, часткі германскай Верхняй Сілезіі па «праву імперыялістычнага разбою». Далей Польшча абвінавачвалася ў падрыхтоўцы агрэсіі супраць Германіі з мэтай уключэння ў свой склад Данцыга і Усходняй Прусіі [23, с. 3–5]. У новых умовах савецкімі гісторыкамі акцэнт рабіўся на супрацоўніцтва польскіх правячых колаў з фашысцкімі дзяржавамі на антысавецкай аснове. Па словах А. Врублеўскага, яны (кіраўнікі польскай дзяржавы – М.М.) гатовыя «хутчэй стаць слугамі Гітлера ў сваёй уласнай краіне, чым пазбавіцца магчымасці трымаць працоўныя масы Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў кабале, галечы і голадзе» [21, с. 208–209]. Л. Ломаў тлумачыў польска-германскае супрацоўніцтва ў сярэдзіне 1930-х гг. тым, што «фашысцкая Польшча заўсёды падтрымлівае тую з імперыялістычных дзяржаў, якая ў дадзены перыяд рыхтуе напад супраць краіны Саветаў». Мэта «змовы» Польшчы з фашысцкай Германіяй як раз і ёсць падрыхтоўка вайны супраць СССР [24, с. 55–56].

У працах В. Гальянава Польшча прадстаўлялася як адзін з галоўных праціўнікаў савецкай палітыкі па стварэнні сістэмы калектыўнай бяспекі, бо менавіта яна разам з Германіяй рашуча выступіла супраць падпісання Усходняга пакта. Таксама Польшча абвінавачвалася ў імкненні стварыць «санітарны пояс» з варожых Савецкаму Саюзу дзяржаў, які аблегчыць напад на яго фашысцкай Германіі [25, с. 41–42]. Далей В. Гальянаў указваў на сумесныя намаганні двух дзяржаў, накіраваныя на процідзеянне стварэнню сістэмы калектыўнай бяспекі ва Усходняй Еўропе. Менавіта Польшча, па меркаванні дадзенага аўтара, з'яўляецца краінай, якая найболей актыўна падтрымлівала дзеянні Германіі па разбурэнні сістэмы бяспекі ў Еўропе. Напрыклад, рэзкія пярэчанні з боку Польшчы сустрэў праект Усходняга пакта, актыўным прыхільнікам якога быў СССР [26, с. 40, 53, 61]. І. Высоцкі канстатаваў, што ў пытанні аб Усходнім пакце выявілася каардынацыя палітыкі Польшчы і Германіі. Польшча заявіла, што яна зможа далучыцца да Усходняга пакта толькі ў тым выпадку, калі да яго далучыцца Германія [27, с. 11].

У агульную парадыгму гістарычных даследаванняў, якая стала пануючай у сярэдзіне 1930-х гг., уносіліся пэўныя лакальныя карэктыроўкі, звязаныя са зменай знешнепалітычнага курсу СССР. Да лета 1939 г., калі асноўнай мэтай савецкай знешняй палітыкі абвяшчалася стварэнне сістэмы калектыўнай бяспекі, галоўную небяспеку з боку Польшчы савецкія гісторыкі бачылі ў наладжванні ёю супрацоўніцтва з Германіяй. Пасля падпісання савецка-германскага дагавора аб ненападзе і далучэння да СССР Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны крытычныя стрэлы савецкіх гісторыкаў былі перанацэлены на супрацоўніцтва Польшчы з заходнімі дэмакратыямі. Аб падтрымцы агрэсіі Польшчы з боку заходніх краін яшчэ падчас польска-савецкай вайны 1919–1920 гг. пісаў у сваіх даследаваннях Ф. Папоў. Згодна яго канцэпцыі, Польшча з'яўлялася ўдзельнікам усіх трох паходаў Антанты супраць Савецкай Расіі. Што датычыцца трэцяга паходу, то ў ім Польшчы адводзілася, па меркаванні дадзенага аўтара, галоўная роля [28, с. 43–44, 55]. А. Матусевіч лічыў, што ідэя Польшчы «ад мора да мора» была «не столькі польскай, колькі антантаўскай і ў першую чаргу французскай агрэсіяй у адносінах да Савецкай Расіі і Германіі» [29, с. 63].

У гістарычных выданнях савецкіх аўтараў прасочваецца выразнае імкненне ўскласці на польскія кіруючыя колы віну за крах польскай дзяржавы ўвосень 1939 г. У. Пічэта ў сваіх даследаваннях робіць Польшчу краінай, якая развязала Другую сусветную вайну: «… польскія кіраўнікі пачалі вайну супраць Германіі» [30, с. 126]. І.Ф. Лочмель таксама вінавáціў Польшчу ў развязванні вайны з Германіяй. Ён пісаў, што польскія кіраўнікі па ўказанні Англіі і Францыі ўвязаліся ў гэтую вайну [31, с. 153].

Перад савецкай гістарыяграфіяй у рамках гістарычнай палітыкі была пастаўлена задача апраўдаць, абгрунтаваць уступленне Чырвонай Арміі на тэрыторыю Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. На гэта яе нацэльваў шэраг дырэктыў партыйных і дзяржаўных органаў [32, с. 9–10]. Для рашэння пастаўленых задач быў арганізаваны шэраг мерапрыемстваў. Напрыклад, 28 верасня – 11 кастрычніка 1939 г. у Інстытуце гісторыі Украіны Акадэміі навук УССР быў прачытаны цыкл навукова-папулярных дакладаў, прысвечаных гісторыі Заходняй Украіны. У 1940 г. на іх аснове быў выдадзены зборнік артыкулаў. Дадзеная кніга мела, галоўным чынам, прапагандысцкі характар, уключала ў якасці дадаткаў шэраг дакументаў, характарызаваўшых палітыку савецкай улады ў дачыненні да Заходняй Украіны [33, с. 112].

Сярод выдадзеных па гарачых слядах падзей у Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі прац адзначым манаграфію І.Ф. Лочмеля. Ён імкнуўся абгрунтаваць уступленне Чырвонай Арміі на тэрыторыю Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Паводле яго канцэпцыі, народы гэтых тэрыторый былі кінутыя на волю лёсу польскім урадам, паднялі паўстанне супраць акупантаў і чакалі дапамогі ад Савецкай краіны [31, с. 154]. У.І. Пічэта ў сваіх працах таксама прыводзіць аргументы на карысць далучэння да СССР беларускіх і ўкраінскіх тэрыторый. Ён пісаў: «Заходняя Украіна… і Заходняя Беларусь… – гэта спрадвечна рускія землі, якія ўваходзілі ў «імперыю Рурыкавічаў». У этнічным плане іх насельніцтва складала адзінае цэлае з іншымі ўсходнеславянскімі плямёнамі». Ён лічыў, што 70 % насельніцтвы Заходняй Украіны – украінцы, а ў Заходняй Беларусі палякаў налічаецца толькі 2,5–5 % [30, с. 3, 126]. У калектыўнай працы «Заходняя Беларусь пад панскім прыгнётам і яе вызваленне» адзначаўся развал польскай дзяржавы пад ударамі германскага войска. У склаўшайся сітуацыі, лічаць аўтары, СССР не мог застацца безуважным да лёсу «адзінакроўных братоў беларусаў і ўкраінцаў. Савецкі ўрад прыняў гістарычнае рашэнне: падаць руку дапамогі сваім братам – беларусам і ўкраінцам, якія насяляюць Польшчу» [34, с. 74]. Па сутнасці, савецкія аўтары паўтаралі ў сваіх працах палажэнні па пытанні далучэння да СССР Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, якія змяшчаліся ў афіцыйных дакументах савецкай дзяржавы.

У цэлым, у савецкай гістарыяграфіі савецка-польскіх адносін у сярэдзіне 1930-х гг. адбыліся глыбокія змены. Савецкія гісторыкі адмовіліся ад прыярытэту класавага падыходу пры раскрыцці зместу гэтых адносін. Практычна знікла з гістарычных даследаванняў згадванне аб сусветнай рэвалюцыі як фактары, уплываўшым на характар савецкай палітыкі ў адносінах да Польшчы. Пры разглядзе адносін паміж СССР і Польшчай асноўны акцэнт стаў рабіцца на змаганне гэтых дзяржаў за перавагу ва Усходняй Еўропе. Дадзенае змаганне з Польшчай разглядалася як працяг традыцыйнай палітыкі царскай Расіі. Такім чынам, мы можам казаць аб змене ў сярэдзіне 1930-х гг. даследчай парадыгмы пры вывучэнні савецкімі навукоўцамі гісторыі савецка-польскіх адносін. Гэтая змена ў рашаючай ступені была абумоўлена эвалюцыяй гістарычнай палітыкі дзяржавы, што ў сваю чаргу было звязана са зменай знешнепалітычнага курсу СССР у сярэдзіне 1930-х г. Савецкая знешняя палітыка вызвалілася ад істотнага ўплыву канцэпцыі сусветнай рэвалюцыі. На першы план выйшла традыцыйная расійская палітыка барацьбы за панаванне ва Усходняй Еўропе. Гісторыкі, якія займаліся вывучэннем знешняй палітыкі СССР, пад уплывам гістарычнай палітыкі дзяржавы, павінны былі змяніць парадыгму сваіх даследаванняў, у тым ліку і савецка-польскіх адносін, каб абгрунтаваць новы знешнепалітычны курс кіраўніцтва краіны. Вопыт савецкай гістарыяграфіі савецка-польскіх адносін міжваеннага часу паказвае, наколькі высокая ступень залежнасці гістарычнай навукі ад палітычнага фактару, асабліва, калі яна вывучае праблемы, не страціўшыя сваёй палітычнай актуальнасці.

**Літаратура**

1. Меньковский, В.И. История и историография: советский Союз 1930-х годов в трудах англо-американских историков и политологов / В.И. Меньковский. – Минск : БГУ, 2007. – 359 с.

2. Czubiński, A. Spory o II Rzeczpospolitą / A. Czubiński. – Poznań : instytut zachodni, 1988. – 84 s.

3. Вялікі, А. Гістарычная палітыка ў Беларусі: 1921–1939 гг. Польскі напрамак / А. Вялікі // Спрэчныя

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пытанні. З гісторыі польска-беларускіх узаемаадносін у 1918–1945 : зб. навук. прац II IV Міжнародных навукова-тэарэтычных канф., Мінск, 2010–2012 / пад рэд. Э. Расоўскага, А. Вялікага. – Мінск, 2013. – 282 с.

4. Алексеева, Г.Д. Развитие советской исторической науки 1917–1923 годы : автореф. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / Г.Д. Алексеева. – М., 1961. – 18 с.

5. Покровский, М.Н. Историческая наука и борьба классов / М.Н. Покровский. – М.–Л. : Гос. соц.-эконом. издат., 1933 – 327 с.

6. Шчарбакоў, В.К. Класавая барацьба і гістарычная навука на Беларусі / В.К. Шчарбакоў. – Менск : Выдавецтва Беларускай акадэміі навук, 1934. – 104 с.

7. Радек, К. Война польских белогвардейцев против Советской России / К. Радек. – М. : Госиздат, 1920. – 24 с.

8. Павлович, М. Война с польскими панами (Польско-шляхетская авантюра) / М. Павлович. – М., 1920. – 32 с.

9. Пічэта, У. Польска-савецкія адносіны і рыскі мір / У. Пічэта // Полымя. – 1928. – № 5. – С. 83–100.

10. Пічэта, У. Польска-савецкія адносіны і рыскі мір / У. Пічэта // Полымя. – 1928. – № 4. – С. 146–166.

11. Суслов, П.В. Политическое обеспечение советско-польской кампании 1920 г. / П.В. Суслов. – М.–Л. : Гос. издат. Отдел воен. лит., 1930. – 174 с.

12. Вислинский, М. Внешняя политика Польши на современном этапе / М. Вислинский // Пропагандист. – 1935 – № 10. – С. 42–47.

13. Мархлевский, Ю. Война и мир между буржуазной Польшей и пролетарской Россией / Ю. Мархлевский. – М. : Госуд. издат., 1921. – 43 с.

14. Мархлевский, Ю. Из истории Польши (посмертные статьи) / Ю. Мархлевский. – М. : Госуд. воен. издат., 1925. – 52 с.

15. Радек, К. Внешняя политика Советской России / К. Радек. – М. : Госуд. издат., 1923. – 112 с.

16. Гражданская война 1918–1921. Оперативно-стратегический очерк боевых действий Красной армии : в 3 т. – М.–Л. : Государственное изд. Отдел военной книги, 1930. – Т. 3. – 560 с.

17. Сталин, И.В. Историческая идеология в СССР / И.В. Сталин. – С.-Пб., 2006. – 494 с.

18. Дубровский, А.М. Историк и власть: историческая наука СССР и концепция истории феодальной России в контексте политики и идеологии (1930–1950-е гг.) / А.М. Дубровский. – Брянск : Издательство Брянского государственного университета им. акад. И.Г. Петровского, 2005. – 800 с.

19. Пихоя, Р.Г. Востребованная временем история. Отечественная историческая наука в 20–30-е годы XX века / Р.Г. Пихоя // Новая и новейшая история. – 2004. – № 2. – С. 28–53.

20. Сталин, И.В. О статье Энгельса «Внешняя политика русского царизма»: Письмо членам Политбюро ЦК ВКП(б). 19 июля 1934 г. // Сочинения : в 16 т. – М. : Изд-во «Писатель», 1997. – Т. 14. – С. 18–23.

21. Врублевский, А. Польша / А. Врублевский. – М. : Гос. соц.-эконом. издат., 1936. – 212 с.

22. Иоффе, Я. Организация интервенции и блокады советской республики 1918–1920. Очерк / Я. Иоффе. – М.–Л. : Гос. издат. Отдел воен. лит., 1930. – 167 с.

23. Волынский, Л. Антисоветский союз шести. Франция и ее союзники / Л. Волынский – М. : Партиздат, 1932. – 40 с.

24. Ломов, Л. Польша и ее армия / Л. Ломов. – М. : Гос. воен. издат., 1935. – 64 с.

25. Гальянов, В. Куда идет Польша / В. Гальянов // Фашистская Польша в тупике – Лн. : Ленинградское областное издат., 1938. – С. 36–46.

26. Лемин, И. Угроза войны и мирная политика СССР / И. Лемин. – М. : Воениздат, 1940. – 80 с.

27. Высоцкий, И. Внешняя политика фашистской Польши / И. Высоцкий // Коммунистический Интернационал – 1935. – № 16–17. – С. 10–17.

28. Папоў, Ф. Барацьба беларускага народа з белапольскімі акупантамі ў 1919–1920 гг. / Ф. Папоў // Бальшавік Беларусі. – 1940. – № 6. – С. 41–59.

29. Манусевич, А. Исторические предпосылки краха Польши / А. Манусевич // Исторический журнал. – 1939. – № 11. – С. 58–69.

30. Пичета, В. Основные моменты развития Западной Украины Западной Белоруссии / В. Пичета. – М.–Л. : Гос. соц.-эконом. издат., 1940. – 136 с.

31. Лочмель, И.Ф. Очерки истории борьбы белорусского народа против польских панов / И.Ф. Лочмель. – М.–Л. : Гос. издат. Отдел воен. лит., 1940. – 163 с.

32. Сяргеева, Г.Г. Гісторыя славянскіх народаў у працах беларускіх савецкіх даследчыкаў / Г.Г. Сяргеева, П.Ц. Петрыкаў, У.М. Міхнюк. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – 36 с.

33. Даниленко, В.М. Ліквідація Польскої державы та встановлення радянского режиму в Західній Україні / В.П. Даниленко // Український історичний журнал. – 2006. – № 3. – С. 111–125.

34. Заходняя Беларусь пад панскім гнётам і яе вызваленне. – Мінск : Выдавецтва Акадэміі навук БССР, 1940. – 96 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 17.01.2018

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ